05

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

№ 20 ЛІПЕНЬ 1931



Кансэрв. ы цэх Аршанскага мясного камбінату.

Дзяржаўная бібліятэка БССР

11 год вызваленьня БССР

Прайшло 11 год з часу вызваленьня БССР ад белапольскай акупацыі. За гэты пэрыяд рабочая кляса Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дасягнула найвялікшых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Ня толькі адбудавана зруйнаваная вайной народная гаспадарка, але шпарка будуецца буйная сацыялістычная прамысловасьць, па сацыялістычнаму перабудоўваецца сельская гаспадарка.

Пабудавана шмат новых буйных прадпрыемстваў, як гомельскі завод сельска-гаспадарчых машын, швэйная фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі" ў Віцебску, фабрыка штучнага валакна ў Магілеве. Уступіў у строй Асінстан. Будуюцца новыя гіганты—Крычаўскі цэмэнтны завод, ільнапрадзільны камбінат у Воршы і шмат іншых. Рад прадпрыемстваў выканалі пяцігодку за 2½ гады.

Найвялікшых посьпехаў дасягнула БССР і ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Калгасамі ахоплена 39,7 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Некаторыя раёны ўжо ў асноўным завяршаюць суцэльную калектывізацыю. У Койданаўскім раёне калектывізавана 91,1 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у Лепельскім раёне—81,1 проц., у Хоцімскім—75,8 проц.

Сельская гаспадарка БССР становіцца важнейшым прадуктарам ільну і іншых тэхнічных культур, мяса і малочных прадуктаў. У гэтым годзе значна выросла пасеўная плошча тэхнічных і кармовых культур, пабудавана шмат жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў.

На аснове росту сацыялістычнай гаспадаркі ўзьнімаецца і культурны ўзровень рабочай клясы і ўсіх працоўных мас БССР. За 11 год Савецкая Беларусь мае нячуваныя посьпехі ў справе разьвіцьця культуры беларускай і нацменшасьцяй, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Калі ў 1925 годзе было 25 тэхнікумаў, 3 рабфакі і 3 ВНУ, дык у гэтым годзе мы маем 80 тэхнікумаў, 20 рабфакаў і 18 ВНУ. Праводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне на мове кожнай з нацыянальнасьцяй БССР.

Гэтых перамог рабочая кляса БССР дасягнула толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі, барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага апартунізму — найбольш небясьпечнага ў сучасны пэрыяд, „левых" загібаў і прымірэнцтва да іх.

Гэтых посьпехаў рабочая кляса дасягнула дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, рашучай барацьбе з контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, нацыянал-апартунізмам і шавінізмамі іншых нацыянальнасьцяй.

Гэтых перамог рабочая кляса БССР дасягнула дзякуючы братэрскай дапамозе пралетарыяту Савецкага Саюзу.

У той-жа час у капіталістычных краінах усё больш узрастае эканамічны крызіс, гіганцкі расьце беспрацоўе і галеча працоўных мас. Узмацняецца рэвалюцыйнае змаганьне пралетарыяту і працоўных мас супроць капіталістычнага ладу, за Савецкую ўладу.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва СССР не даюць спакою сусьветным імпэрыялістам. Іх надзеі на крах нашай пяцігодкі ня зьдзейсьніліся. Ліквідуецца кулацтва як кляса на аснове суцэльнай калектывізацыі. Шкодніцкая дзейнасьць контррэвалюцыйных арганізацый выкрыта, руйнуючы ўдар нанесен нацыянал дэмократам—агентам польскага фашызму. Усё гэта павялічвае нянавісьць да нас капіталістычнага сьвету. Буржуазія ўзмоцнена рыхтуецца да вайны. Аб гэтым выразна сьведчыць рост узбраеньняў капіталістычных краін, у першую чаргу нашых „суседзяй"—Польшчы і Румыніі.

Польскі фашызм імкнецца нячуваным тэрорам, забойствамі і арыштамі камуністаў і рэвалюцыйных рабочых і сялян, карнымі экспэдыцыямі на Заходняй Беларусі і Украіне задушыць нацыянальна-вызваленчы рух у акупаваных мясцовасьцях, рэвалюцыйны рух па ўсёй Польшчы, каб падрыхтаваць тыл для новай вайны супроць СССР.

Аб гэтым павінны памятаць работніцы, калгасьніцы і ўсе працоўныя жанчыны БССР. Мацуючы міжнародную сувязь з працоўнымі капіталістычных краін, мы гатовы кожную хвіліну абараняць СССР—сацыялістычную бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Мы павінны дабівацца яшчэ большага паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Падпіскай на пазыку „Трэці рашаючы" работніцы, калгасьніцы, бяднячкі і сераднячкі дапамагаюць хутчэйшаму пуску „518" і „1.040".

Актыўным удзелам у сацспаборніцтве, у рацыяналізатарскай рабоце, у барацьбе супроць абязьлічкі, браку і прагулаў, работніцы дапамагаюць выкананьню прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Барацьбой за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за зьдзельшчыну, за бальшавіцкае правядзеньне ўборачнай кампаніі калгасьніцы дапамогуць выкананьню пляну калектывізацыі да вясны 1932 г. 75 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ЕССР.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—да новых перамог!

Расьце беспрацоўе работніц у Нямеччыне

Страшэнны рост беспрацоўя служыць адным з самых яркіх праяўленьняў агульнага крызісу манапалістычнага загніваньня памiраючага капіталізму.

У Нямеччыне ў сярэдзіне сакавіка 1931 году было 5 з паловай мільёнаў беспрацоўных і 3850 тысяч часткова беспрацоўных, прычым жанчыны складаюць адну трэцюю беспрацоўных. Агульны лік беспрацоўных у Нямеччыне дасягнуў 24 мільёнаў чалавек.

Увесь цяжар крызісу і беспрацоўя капіталісты імкнуцца пераваліць на плечы працоўных. Побач са скарачэньнем зарплаты яны вядуць таксама шалёнае наступленьне на сацыяльнае страхаваньне.



Паліцыя зьбівае беспрацоўных дэманстрантаў у Нямеччыне.

Але і там, дзе існуе сацыяльнае страхаваньне, буржуазія пры актыўным падтрыманьні сацыял-фашыстаў, скарачае як дапамогу, так і пэрыяд выдачы дапамогі, падаўжае неабходны для атрыманьня дапамогі тэрмін, памяншае лік людзей, якія маюць права на атрыманьне дапамогі.

У студзені 1930 году ў Нямеччыне адбылася нарада прадстаўнікоў капіталістычных краін, на якой была прынята пастанова аб неабходнасьці перакласьці на саміх рабочых усе выдаткі па сацыяльным страхаваньні.

У Нямеччыне буржуазія з удзелам сацыял-фашыстаў і прафсаюзных бюракратаў праводзіць павышэньне ўзносаў рабочых у фонд страхаваньня па беспрацоўі з трох да 6 процантаў.

Урадавы праект прадугледжвае „эканомію“ на дапамогах па беспрацоўі ў 265 мільёнаў марак, на забесьпячэньні па хваробах і інваліднасьці ў 119 мільёнаў марак. З $5^1/_2$ мільёнаў беспрацоўных мяркуецца выплачваць дапамогу толькі 1750 тысячам чалавек.

Фашысцкі ўрад Брунінга прапануе сродкі з фонду сацыяльнага страхаваньня перадаць прамыслоўцам для аднаўленьня прамысловасьці. Так са згоды рэфармісцкіх хрысьціянскіх прафсаюзаў урад вырашыў перадаць 10 мільёнаў марак уласьнікам тэкстыльных прадпрыемстваў—Кюнкэн-Гляў-

баха з тым, каб апошнія далі работу 5 тысячам рабочым, выплачваючы ім толькі розьніцу паміж дапамогай і тарыфнай стаўкай.

У Нямеччыне работніца, якая плаціла на працягу многіх гадоў у касу сацыяльнага страхаваньня, у выпадку беспрацоўя нічога не атрымлівае, калі муж яе зарабляе больш 45 марак у тыдзень. У выпадку, калі муж і жонка страцілі работу, то дапамогу па беспрацоўі яны атрымліваюць у палове разьмеру тэй зарплаты, чыя з іх была меншая.

У Нямеччыне $^1/_3$ беспрацоўных жанчын зусім пазбаўлена дапамогі. Большасьць з іх нічога не атрымлівае, а нязначная частка жыве невялікімі падачкамі дабрачыннага таварыства.

У выпадку адмаўленьня ад работы, як непадыходзячай, адбіраюць картку і пазбаўляюць дапамогі. На біржах, дзе беспрацоўныя рэгіструюцца, адносіны з імі самыя грубыя. Нават у рэдкіх выпадках, калі работніцы просяць вызваліць іх ад адметкі, і гэта не дазваляецца.

На Бэрлінскай біржы быў такі выпадак: муж аднэй работніцы памiраў дома, але яе ня вызвалілі ў гэты дзень ад адметкі. Пакуль яна хадзіла на біржу, муж яе памёр.

Асабліва цяжкае становішча работніц, якія атрымліваюць дапамогу па беднасьці.

На кангрэсе працоўных жанчын у Нямеччыне, восеньню 1930 году, адна старая змораная жонка рабочага расказала: „Чатыры тыдні таму назад памёр мой муж, ён быў пазбаўлен дапамогі на беспрацоўі, і таму ён не атрымліваў таксама і больнічнай дапамогі. Я не магла наведваць свайго мужа ў больніцы таму, што ў мяне ня было грошай на праезд. Я падала ў апеку аб бедных тэрміновую просьбу аб выдачы мне дапамогі.

Гэта просьба на працягу трох тыдняў праляжала ў старшыні апекі. Тым часам мой муж ужо памёр.

Урэшце, пасьля доўгіх мытарстваў, я атрымала адначасовую дапамогу ў разьмеры 20 марак. На гэтыя грошы я павінна была пахаваць свайго мужа, заплаціць за кватэру, апрануцца і пражыць. Я пашла ў больніцу і папрасіла, каб пахавалі майго мужа за рахунак гораду. Сёньня-ж я атрымала рахунак, у якім значыцца, што я павінна заплаціць за пахаваньне 107 марак.

Хутка пасьля сьмерці мужа я атрымала ад кватэрнага бюро паведамленьне аб тым, што павінна ачысьціць памяшканьне на працягу трох дзён. Галодная, босая засталася я зараз, зусім бяз даху над галавой“.

Асабліва вялікую пакуту прычыняе беспрацоўным выгнаньне з памяшканьняў за няўзнос платы. У ваколіцах Бэрліну існуюць цэлыя кварталы зямлянак, у якіх жывуць беспрацоўныя. Знайсьці месца ў пакойніцкай—і то лічаць вялікім шчасьцем.

На кангрэсе працоўных жанчын Памэраніі (Нямеччына) дэлегатка расказала аб тым, што ў яе родным горадзе сям'я беспрацоўнага, якая складаецца з бацькі, маткі і 10 чалавек дзяцей ужо на працягу 4-х гадоў жыве ў пакойніцкай.

З. Баярская.

„Ліквідаваць абязьлічку, палепшыць арганізацыю працы, правільна расставіць сілы на прадпрыемствы—такава задача".

(Сталін на нарадзе гаспадарнікаў).

На барацьбу за поўнае выкананьне пляну 3-га рашаючага

Ліпенскі пленум ЦК КП(б)Б падвёў вынікі выкананьня прамфінпляну прамысловасьці БССР за першую палову 1931 г.

За першае паўгодзьдзе 3-га рашаючага году пяцігодкі прамысловасьць БССР, як і ўсяго Савецкага Саюзу, дасягнула вялікіх посьпехаў. Па рэспубліканскай прамысловасьці прырост валавой прадукцыі павялічыўся на 35 проц. і па прамысловасьці Наркамснабу на 33,4 проц. параўнальна з першай паловай 1931 году.

Але разам з гэтымі посьпехамі мы маем прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Рэспубліканская прамысловасьць недадала краіне 14,9 проц. прадукцыі, паводле прамфінпляну, за 5 месяцаў 1931 году.

У чым прычына гэтых прарываў? Яны заключаюцца ў слабым кіраўніцтве гаспадарчых арганізацый, павольнай перабудове партыйнай і прафэсыянальнай работы і гаспадарчага кіраўніцтва на прадпрыемствах, у фармальным правядзеньні гаспадарчага разрахунку. У выніку мы маем незабясьпечанасьць прадпрыемстваў рабочай сілай, няправільную расстаноўку рабочай сілы і яе цякучасьць.

У трэцім годзе пяцігодкі мы завяршаем пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. На выкананьне прамфінпляну 3-га рашаючага мы павінны напружыць усе нашы сілы. Прамфінплян нашай прамысловасьці зусім рэальны: аб гэтым сьведчыць посьпяховае выкананьне плянаў радам прадпрыемстваў: завод „Бальшавік" выканаў плян на 102,8 проц., швэйная фабрыка „Кастрычнік"—на 105,2 проц.. швэйная фабрыка імя Валадарскага—на 110,8 проц., гомельская гарбарня—на 107,7 проц. і г. д. Даючы рашучы адпор правааапартуністычным разважаньням аб немагчымасьці выканаць плян, мы атрымаем перамогу ў барацьбе за прамфінплян трэцяга рашаючага.

Пленум ЦК КП(б)Б высунуў адказныя задачы ў справе паляпшэньня працы нашай прамысловасьці. Важнейшай умовай гэтага паляпшэньня зьяўляецца перабудова партыйнай і прафэсыянальнай работы на вытворчасьці, перабудова гаспадарчага кіраўніцтва прамысловасьцю.

Сур'ёзная задача стаіць у галіне забесьпячэньня прамысловасьці рабочай сілай. Ад самацёку ў гэтай справе трэба перайсьці да арганізаванай вярбоўкі рабочай сілы шляхам дагавораў з калгасамі.

Трэба дабіцца ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце прадпрыемстваў, як гэта зроблена ўжо на транспарце, правільна расставіць рабочую сілу, каб кожны гаспадарнік і рабочы ў цэху адказвалі за сваю работу і машыну. Глыбей укараніць гаспадарчы разрахунак ва ўсёй рабоце прадпрыемстваў.

Трэба пакончыць з ураўнілаўкай у зарплаце, пры якой высока-кваліфікаваны рабочы атрымлівае часамі аднолькава з падсобным. Правільная сыстэма зарплаты павінна зацікавіць кожнага рабочага і работніцу павышаць сваю кваліфікацыю. Гэта зьнішчыць тую цякучасьць рабочай сілы, якая існавала да гэтага часу.



Цэх зборак сіласарэзак на Гомсельмашы.

Дабіваючыся поўнага выкананьня прамфінпляну на ўсіх вучастках работы, трэба асаблівую ўвагу аддаць мэталяпрамысловасьці, прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў і тарфяной. Трэба ліквідаваць прарывы ў вырабе будматар'ялаў і здабычы торфу, які павінен забясьпечыць апалам нашу прамысловасьць. На гэта трэба мабілізаваць усю пралетарскую грамадзкасьць.

Пленум ЦК КП(б)Б асабліва падкрэсьліў задачу барацьбы за якасьць прадукцыі і зьніжэньне сабекошту. У барацьбе за выкананьне нашых плянаў і паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочых мас якасьць прадукцыі адыгрывае вялікую ролю. Калі фабрыка выпускае дрэннай якасьці вопратку, абутак ці іншую прадукцыю,—гэта б'е па бюджэце рабочага.

Яшчэ больш разгортваючы сацспаборніцтва, уцягваючы новых работніц ва ўдарныя брыгады, змагаючыся за аўладаньне тэхнікай, мы пераможам у барацьбе за прамфінплян.

А. Н.

Актыўным удзелам работніц у вытворчых нарадах і ў рацыяналізатарскай рабоце даб'емся поўнай ліквідацыі прарываў і непаладак у вытворчасьці

Забясьпечыць бесьперабойнасьць у рабоце

На фабрыцы „Вэзуві" шмат неладаў.

Каробачны цэх дае каробку дрэннай якасьці. Вінавата ў гэтым вось што.

Заступае на работу новая зьмена, пачне працаваць—пары не хапае, сушня ня сушыць. А каробкі кіснуць яшчэ з другой зьмены.

У качагарцы няма людзей, няма дроў. Прыбяжыць загадчык цэхам, спыняе нашы варштаты гадзіны на дзьве, а работніц пасылае ў качагарку цягаць дровы. Наносяць работніцы дроў, пойдзе пара, і толькі тады зноў—да варштатаў.

Калі паламаецца што ў варштаце, то ні тэхкіраўніка, ні мэханіка ніколі ня знойдзеш. Вядома, што і такая неарганізаванасьць б'е па выкананьні прамфінпляну і па якасьці прадукцыі.

Адміністрацыя, тэхнічны кіраўнік, грамадзкасьць фабрыкі, трэба безадкладна зьнішчыць шкоднае саматужніцтва і паказаць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы.

Работніца.

Н. Беліца.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя чакае тэрміновага адказу кіраўніцтва фабрыкі аб тым, якія ўжыты захады для зьнішчэньня адзначаных у допісе недахопаў.

Дэкада штурму праведзена бяз мас

14-га чэрвеня фабрыка зноў, пасьля перапынку для адпачынку, прыступіла да работы. Агрэгаты перабудаваліся на лентачную сыстэму работы. Але работа ня ўзрухнулася, як гэтага чакалі.

Ня ўсе рабочыя сваячасова зьявіліся на работу. Многія ўзялі разьлік і пайшлі на другія работы. Асабліва няяўка на работу наглядалася сярод работніц, якім ня было куды дзяваць сваіх дзяцей.

Акрамя гэтага было шмат непаладак у абсталяваньні: машыны дрэнна работалі, не ў парадку былі і прэсы. Некаторыя рабочыя былі не прыстасаваны да сваіх апэрацый.

У выніку гэтага атрымаўся вялікі прарыў. Прамфінплян быў выканан за 17 дзён на 45 50 проц.

Гэта тлумачыцца тым, што пасьля адпачынку партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі фабрыкі не мабілізавалі ўвагу рабочых на новую сыстэму работы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва было ў заняпадзе.

Парткалектывам і фабкомам фабрыкі быў абвешчан дэкаднік штурму па ліквідацыі прарыву прамфінпляну. Але трэба сказаць, што дэкада пачалася без належнай масавасьці. Была пастанова

т. Грышкевіч брыгадзір брыгады пайкі і рамонту (зав. Лепсе), узнагароджана ордэнам Леніна.

бюро парткалектыву, за тым „шырокая" вытворчая нарада, на якой прысутнічала 40-50 чалавек, з ліку 1800 рабочых. І гэта ўсё, што было зроблена.

Шырокая маса рабочых ня ведала, аб дэкадніку, і калі ў цэх зьявіўся сыгнальны пост з чырвонай павязкай, рабочыя адзін у аднаго пыталіся: „што гэта сёньня сьвята якое, альбо што?"

Рапорт сыгналістых не падагульваецца, яны адмячаюць адны і тыя-ж недахопы, а адміністрацыя ня прымае досыць рашучых мер да зьнішчэньня гэтых недахопаў.

За апошнія некалькі дзён усё-ж стаў адчувацца некаторы зрух ў партыйнай і прафэсыйнай рабоце. Прамфінплян за гэтыя некалькі дзён падняўся да 75 проц.

З перавыбарамі лентачных ячэек і прафкамітэтаў з заключэньнем сацдагавароў паміж лент і груп плян будзе перавыканан. Прарыў прамфінпляну ліквідуем пад кіраўніцтвам парткалектыву.

Міндліна, Памеранц, Манпіль.

Аўладаем тэхнікай, падымем актыўнасьць рабочага выналодзтва

17-га чэрвеня на фабрыцы „Чырвоны тэкстыльшчык" быў арганізован вечар рабочай кемлівасьці. Паставілі даклад аб аўладаньні тэхнікай, аб выкананьні прамфінпляну за 5 месяцаў 1931 г.

На вечары завастралася пытаньне аб прарыве, бо фабрыка недавыканала больш чым на 20 проц. свой плян. У прэзыдыум паступіла шмат заяў з рознымі прапановамі па паляпшэньні працы на вытворчасьці.

У вытворчы сэктар паступіла вельмі каштоўная прапанова працаваць аднэй панчошніцы на дзьвёх машынках замест аднэй, і вынікі ўжо ёсьць. Напрыклад, работніца тав. **Радашкоўская** 18 чэрвеня на дзьвёх машынках зрабіла 55 пар замест 33 пар паводле прамфінпляну, гэта прапанова пачынае праводзіцца на практыцы.

Тут-жа на вечары арганізавалася новая камуна работніц цыравальнага цэху, якая дала сустрэчную норму выпрацоўкі—36 дзесяткаў панчох замест 34.

Камунаркі падпісаліся на пазыку „Трэці рашаючы" на 100% месячнага заработку і выклікалі на сацспаборніцтва ўсіх работніц.

Менск. **Завялевіч А.**

Правільна скарыстаць грамадзкую актыўнасьць жонак рабочых

Дэлегаткі заводу „Зьвязда"—жонкі рабочых—з вялікай ахвотай выходзяць на суботнікі, на работу па ліквідацыі прарыву. Толькі не заўсёды гэтай справай кіруюць як належыць.

Ня так даўно выйшлі жанчыны на работу. Жанарганізатар паклікаў на працу, але загадзя ня ўмовіўся аб гэтым з адміністрацыяй. Майстры ганялі хатніх гаспадынь з месца на месца.

Адзін майстар прапанаваў дэлегаткам вярнуцца дамоў і прыйсьці на працу ў другую зьмену. Толькі пасьля скаргі дэлегатак жанарганізатар умовіўся з адміністрацыяй, якая вызначыла для дэлегатак работу.

Дэлегатка.

Пятроўскі раён.

Ад калгасьніц і калгасьнікаў „Ленінскага Шляху“, Самахвалавіцкага сельсавету работніцам заводу „Бальшавік“

Таварышы работніцы!

У адказ на ваш ліст мы паведамляем аб росьце нашага калгасу „Ленінскі Шлях“, як часткі агульнай сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Наш калгас існуе другі год. У гэту вясну ў калгас уліліся 84 новыя гаспадаркі. Зараз калгас аб'яднае 263 гаспадаркі і дзеліцца на 8 аддзяленьняў.

Ва многіх населеных пунктах па-за калгасам засталося толькі па 1-2-4 гаспадаркі.

У нас аграмаджана ўся рабочая і частка рагатай жывёлы, згодна статуту і ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар.

За гэты час наш калгас выгадаваў 85 штук маладняка. Кармамі мы забясьпечылі ня толькі сваё стада, а нават увесну дапамаглі суседнім калгасам. Гэтаму спрыяла тое, што летась мы мелі сіласную яму. Такім-жа чынам мы забясьпечым сябе кармамі і сёлета, тым больш, што стада наша ўвесь час павялічваецца, а да канца 1932 году мы будзем мець абагуленае малочнае стада ў 300 штук.

Мы ўсе, нават маткі, у якіх ёсьць малыя дзеці, выходзім на працу. Дзякуючы гэтаму, плян веснавой сяўбы мы выканалі на 155 проц.

Гэтых посьпехаў мы дабіліся на падставе генэральнай лініі нашай партыі, ліквідуючы кулацтва як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі.

Але ёсьць у нас і недахопы. Галоўная гэта тое, што ў нас дасюль не праведзена зьдзельшчына, праца яшчэ ня ўлічваецца па працаднёх, ня маюць зусім калгасьнікі разрахунковых кніжак. У нашым калгасе з усіх 17 населеных пунктаў толькі ў двух ёсьць дзіцячыя яслі. Вось гэта нашы недахопы.

У адказ на ваш выклік, каб забясьпечыць свая-часовае і лепшае правядзеньне ўборачнай і загатовак мы парашылі наступнае:

1. **Да пачатку ўборачнай дабіцца 100-процантнага пераходу на зьдзельшчыну і ўліку працы па працаднёх.**

2. У нашых уборачных брыгадах мы **будзем працаваць па-ўдарнаму**, разгарнуўшы сацспаборніцтва, мы дабемся таго, каб няўбраным не застаўся ня толькі ні адзін гэктар, але і ні адзін мэтр ураджаю.

3. Мы **ствараем ударную брыгаду друку з 7 асоб**, якая дапаможа арганізаваць і будзе асьвятляць у часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ нашу падрыхтоўку і правядзеньне ўборачнай, загатовак, а таксама ўвесь вопыт нашай работы.

Уборка сена коннымі граблямі ў саўгасе „Катлубань“, Сталінградзкага раёну.

4. Мы просім калгас „Расьсьвет-пераможца“ і другія лепшыя калгасы стварыць ударныя брыгады друку, каб яны праз часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ і газэты падзяліліся з намі вопытам арганізацыі працы і ўсёй работы калгасаў.

5. **На заклік работніц заводу „Бальшавік“ мы сёньня на сходзе падпісаліся на пазыку „3-га рашаючага“ ў суме 1950 рублёў, будзем працягваць падпіску на пазыку і выклікаем на сацспаборніцтва калгасы: імя Варашылава (вёска Пяцешчына) і калгас „Бальшавік“ (Валіцкаўшчына).**

Па даручэньні сходу падпісалі сябры прэзыдыуму:

Кашкан, Лішай, Бакіноўскі

Зьдзельшчына падняла прадукцыйнасьць працы

Зьлёты калгасьніц, праведзеныя ў радзе сельсаветаў Крычаўшчыны, а таксама раённая канфэрэнцыя калгасьніц,—сьведчаць аб уздыме актыўнасьці сярод працоўных жанчын. У спрэчках было выяўлена, што ў гэтым годзе жанчыны прымалі больш актыўны ўдзел у веснавой сяўбе. У калгасах, дзе праведзена зьдзельшчына, мы маем высокія паказальнікі работы. Па накідваньні гною жанчыны выпрацоўвалі па дзва працадні за адзін дзень, даільшчыцы, выдаіўшы па 16 кароў, ішлі на поле і выпрацоўвалі яшчэ адзін працадзень на полі.

Цікава, што ў нацыянальным яўрэйскім калгасе старыя мужчыны і кабеты працавалі ў дні рэлігійных сьвят. Ёсьць калгасьніцы, якія аралі пад рад 14 дзён.

Ва многіх калгасах лепшыя ўдарніцы былі прэміяваны. Некаторыя калгасьнікі заяўляюць, што з посьпехам справіліся з веснавой сяўбой, дзякуючы ўдарнай працы жанчын.

Але ў зьлёце калгасьніцы адзначылі, што ёсьць яшчэ некаторыя калгасы, дзе жанчыны ня прымаюць удзелу ў розных работах, спадзяючыся на „ўраўнілаўку“. У такіх калгасах зьдзельшчына праведзена фармальна. Няма ўліку працы, калгасьніцы ня ведаюць, колькі яны вырабляюць. Няма працоўных кніжак.

Крычаўскі раён.

А. Г.

Шэфы і падшэфныя

Званок абвясьціў перапынак. Насьпех спраўляліся з абедам. Сёньня сход работніц 2-га хромавага і жэлятыннага.

Пры кожным цэху—чырвоны куток. На сьценах плякаты, некалькі лёзунгаў.

— І чаму газэт сьвежых на сталох няма? Пачыталі-б у перапынку. Шляпіць культсэктар.

Заўвага правільная.

На прадпрыемстве работніца жыве па сыгнале. Сыгнал адзін для ўсяго цэху. Таму і на сход сыпаліся ўсе разам.

Прышлі, каб усім у адзін голас падаць выклік падшэфным калгасьніцам: ва ўборачную ўзяць тэмпы чырвонасьцяжнага шэфа—„Бальшавіка".

Работніцы „Бальшавіка" ведаюць, як змагацца за прамфінплян, як перамагаць. Ня толькі загадчык цэху, ня толькі майстар, а кожная работніца ведае сваю норму—свой „прамфінплян" на кожны дзень. Перш чым стаць да варштату, кожная праверыць яшчэ раз на сьцяне, на колькі процантаў учора перавыканала норму, колькі вырабіць трэба сёньня.

Мэтод перамог выверапы: сацспаборніцтва, ударная работа, зьдзельшчына, а не ўраўнілаўка.

„Даем сустрэчны. Усе да аднэй будзем ударніцамі. Ніводнага прагулу, ці спазьненьня"—гэта абавязацельствы работніц.

У лісьце да калгасьніц работніцы чырвона-сьцяжнага патрабуюць ударнай работы ад калгасьніц ва ўборачнай. Вопыт работы на заводзе бяруцца перадаць падшэфным.

З лістом у калгас выправілі брыгаду. У брыгадзе галоўным пасланцом шпрацоўшчыца хромавага—Халадзінская Матруна.

Халадзінскай у полі, як і на заводзе, праца знаёмая. З 24 год свайго жыцьця яна 3 гады на заводзе, а 12 год батрачыла ў вёсцы. Таму ўдарнасьць заводу перакласьці на калгасную працу ёй лягчэй, як каму іншаму.

***

Зьмеркла. Разамлелае за дзень пад сонцам поле соладка дыхнула канюшынай. Мераючы крокам сьцежку, якая бегла каля жыта, адзін з нашай брыгады глыбока глынуў пахучага вячэрняга паветра і сказаў сам пра сябе:

— Тут прамфінплян можна выканаць на ўсе 150.

Ад разьезду да Самахвалавіч—8 кілёмэтраў. Крочым пехатою. Брыгаднікі сёньня адпрацавалі ўжо за варштатам па 8 гадзін. Зараз да падшэфных, нанач, на некалькі дзён. Пра стомленасьць успамянуў адзін. Яго ніхто не падтрымаў. Хіба можна падтрымаць, ідучы з такім даручэньнем: перадаць калгасу вопыт бальшавіцкіх тэмпаў.

У Самахвалавічах—нас ашарашылі:

— Можа на спэктакль пройдзем у саўгас.

Мы думалі тут час пагублялі. Гадзіна ночы. Заўтра досьвіткам на працу.

— У нас заўсёды так: пакуль працу скончаць—ноч на дварэ.

Так новыя людзі падкія да культурнай стравы.

Аб культурным росьце сьведчыць ня толькі гэта. На царкве былой замест крыжа—зорка, гэта клюб зараз. З сынагогі шыльда крычыць: арцель краўцоў „Чырвоны кастрычнік".

***

Мы папалі ў вёску Куркавічы—4-е аддзяленьне буйнейшага калгасу ў сельсавеце „Ленінскі шлях".

Яшчэ два гады таму назад на абшарах усіх гэтых 17 вёсак і пасёлкаў ня было і сьледу калгаснага. Прышла пара, узварухнуліся вёскі, высокая хваля калгаснага руху і сюды дакацілася. Тады сказала 70-гадовая Лісавета Лішай:

— Тры гады я аджынала калісь кулаку Сянкевічу за пазычаныя 10 рублёў. Не з дабра пазычаць ішлі да павука. Зараз новыя часы насталі.

18 гаспадарак вёскі Куркавічы крута павярнулі ў калгас. Зачыншчыкі былі такія-ж, як і Лісавета, раней мелі, хто паўтары дзесяцінкі, хто больш крыху, хто зусім батрачыў.

Зямлі многа, а рук мала. Памаглі трактары, і саўгаская снапавязалка. Ва ўборачную выбраліся гэроямі.

— Варта гаспадарыць па-калгаснаму,—сказалі аднаасобнікі.—Зараз там, дзе два гады назад бедната толькі ў думках хавала калгас, ва многіх вёсках заставаліся па адным-два аднаасобнікі. У „Ленінскім шляху"—263 гаспадаркі.

***

Працуюць дружна. Усё-ж такі ня кожны аднолькава ўпраўны. Валодзька Ганна, Шыманская Наста, Лішай Ганна, Радзюк Мар'я—прыклад даюць.

Кожны месяц даяркі зьмяняліся.

— Цяжкая і невясёлая работа. Лепш у полі,—казалі.

Знайшліся адважныя, у тым ліку Лішай Ганна.

— Станем даіць.

Ужо больш году Ганна доіць. Тры разы ўдзень падоіць 10 кароў. Бывае, ныюць рукі, але гэта ня з месца.

У 8-мі аддзяленьнях „Ленінскага шляху" толькі двое ясьляй, трэба тут кіраўніцтву і актыву быць рухавейшым, цяжка маткам з малымі на поле ісьці.

А галоўная хіба ў колгасе, гэта тое, што дасюль не перайшлі на зьдзельную працу. Нават ня ўсе калгасьнікі зразумелі карысьць зьдзельшчыны. Аплата працы ідзе па гадзінах.

Прызналіся ў гэтым калгасьнікі, адказваючы на ліст работніц „Бальшавіка".

Ліст абгаварвалі на агульным сходзе вёсак: Куркавічы, Засьценка, Шкендзераўка і пасёлку Люнавіны. Доўга гаварылі пра зьдзельшчыну, як перавесьці на яе калгасную работу. А пасьля парашылі.

— Так адкажам заводу „Бальшавік". Мы за зьдзельшчыну. Да ўборачнай пяройдзем на зьдзельную аплату. Просім шэфаў дапамагчы. Будзем працу ўлічваць па працаднёх. Будзем працаваць ударнымі брыгадамі. Ніводнага гэктара, ніводнага мэтра ўраджаю не пакінем на полі.

Сход калгасьнікаў на заклік работніц адказаў падпіскай на пазыку на суму 1950 рублёў. Ганна Лішай—адна з першых калгасьніц падпісалася на 50 рублёў.

В. Х.

БУДУЕМ 518

Цэмэнтны завод Гігант у Крычаве.

1. Пабудова выцяжной трубы. Труба будзе па велічыні другой ў СССР.
2. Агульны выгляд пабудовы.
3. В. Маліноўская — дзесятнік на пабудове трубы — лепшая ўдарніца.
4. На пабудове трубы заводу.
5. Пабудова эяеватара.
6. Рабочая брыгада наўкольных калгасаў на суботніку па пабудове. Дапамагаюць ліквідаваць прарыў.
7. Пабудова электрычнай станцыі, якая будзе асьвятляць прылеглыя раёны і дастаўляць энэргію заводу.

Узьняць тэмпы гарадзкога дабрабыту

Чэрвенскі пленум ЦК УсеКП(б) у якасьці баявога заданьня для ўсіх партыйных, савецкіх і прафсыянальных арганізацый паставіў задачу хутчэйшай ліквідацыі адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Індустрыялізацыя краіны, пабудова новых прамысловых гігантаў, перабудова сельскай гаспадаркі на сацыялістычных пачатках вядзе ня толькі да росту гарадзкога насельніцтва, але да ўзьнікненьня новых сацыялістычных гарадоў, якія па-

Новы дом пабудаваны Гомельскім Жактам.

вінны забясьпечваць культурны ўздым і ахову здароўя шырокіх працоўных мас, вызваліць жанчыну ад ярма хатняй гаспадаркі.

Савецкая ўлада толькі за апошнія 3 гады пасьля таго, як ёй удалося аднавіць прамысловасьць і сельскую гаспадарку, магла сур'ёзна заняцца справай гарадзкога дабрабыту.

За гэтыя тры гады дасягнуты вялікія посьпехі ў адносінах паляпшэньня камунальнай гаспадаркі.

Тысячы рабочых сем'яў пераселены з цёмных, брудных, вільготных сутарэньняў у сьветлыя, сухія кватэры, выросьлі новыя рабочыя пасёлкі з сотнямі дамоў. Значна палепшыўся дабрабыт рабочых акраін. Па БССР на працягу трох год выдана каля 30 мільёнаў рублёў на жыльлёвае будаўніцтва.

Да вайны існавалі вадаправоды толькі ў чатырох гарадох БССР, у іншых насельніцтва карысталася вадой з рэчак і студняў.

За час савецкай улады пабудаваны новыя вадаправоды ў Бабруйску і Полацку. Пашыраецца вадаправодная сетка ў Віцебску, Магілеве і Мазыры. Пабудован рад новых электрастанцый у гарадох БССР.

Да 1917 году існаваў трамвай толькі ў Віцебску, з 1929 году пабудован трамвай у Менску.

Замест саматужных брудных пякарань працуюць новыя мэханізаваныя хлебазаводы ў Менску, Гомелі, Магілеве і ў іншых гарадох.

У Менску пракладзена каналізацыя, будуецца аўтаматычная тэлефонная станцыя, фабрыка-кухня, дзяржаўная бібліятэка. Выросьлі амаль адзіныя ў СССР клінічны і універсытэцкі гарадкі, пабудаваныя паводле апошняга слова навукі і тэхнікі.

З кожным годам расьце лік устаноў, якія дапамагаюць жанчыне вызваліцца ад ланцугоў хатняй працы, прыняць удзел у сацыялістычным будаўніцтве. Сетка ўстаноў ахматмладу за час з 1926 году павялічылася амаль на 150 проц. Дзякуючы паляпшэньню дабрабыту мас і шырокім аздаравіцельным мерапрыемствам, сьмяротнасьць дзяцей да аднаго году зьменшылася з 10,4 проц. да 7—8 проц.

Надзвычайна пашырылася сетка грамадзкага харчаваньня. У адным Менску лік сталовак за тры гады павялічыўся амаль у 5 раз. Адкрыта 10 самадзейных сталовак пры ЖАКТ'ах.

У корані зьмяніўся твар нашых гарадоў. Чыноўніцка-мяшчанска-гандлёвыя цэнтры ператвараюцца ў буйныя індустрыяльныя гарады. У гэтым годзе тысячы жанчын павінны быць уцягнуты ў прамысловасьць БССР.

Зусім зьмянілі свой выгляд рабочыя акраіны, аб якіх менш за ўсё клапаціліся былыя купецка-дамаўласьніцкія думы. На акраінах Менску, Віцебску, Барысава і інш. выросьлі новыя амбуляторыі, праведзены трамвайныя лініі, пабудаваны дыспансэры, сталоўкі, сямігодкі, сады і клюбы.

Аднак, як канстатаваў пленум ленінскага ЦК, рост камунальнай гаспадаркі, рост дабрабыту гарадоў адстае ад тэмпаў індустрыялізацыі, ад тэмпаў росту гарадзкога насельніцтва.

Факты з жыцьця гарадоў БССР цалкам пацьвярджаюць гэта. Возьмем Менск.

Хатнія гаспадыні на сваіх плячох адчуваюць недахват пральняў у горадзе. Адна мэханізаваная пральня зусім не спраўляецца з абслугоўваньнем тысяч спажыўцоў. Жыцьцё патрабуе неадкладнай пабудовы яшчэ аднэй-двух мэханізаваных пральняў.

Дрэнна абслугоўваюць насельніцтва і лазьні гораду, якія ня могуць ахапіць усіх жадаючых. Пабудова новай лазьні, разьлічанай на абслугоўваньне большай колькасьці насельніцтва, чым цяперашнія лазьні,—чарговая задача дня.

Сталоўкі гораду ня могуць прапусьціць усіх жадаючых, чаргі ня зьнішчаны дагэтуль. Пабудова фабрыкі-кухні павінна палепшыць грамадзкае харчаваньне.

Сетка ўстаноў ахматмладу і амбуляторый не здавальняе запатрабаваньняў насельніцтва гораду, якое расьце з кожным годам. Трэба значна пашырыць гэту сетку.

Менская электрастанцыя, працуючы з вялікай перагрузкай, ня можа задаволіць попыт на электраэнэргію прадпрыемстваў і рабочага спажыўца. Толькі пабудова новай магутнай электрастанцыі, пабудова цёпла-электрацэнтралі можа палепшыць забесьпячэньне Менску электраэнэргіяй. Трэба фарсаваць будаўніцтва новай станцыі, каб унікнуць перабояў у падачы энэргіі.

У Навінках зараз будуецца новая вадаправодная станцыя. Нельга ні ў якім разе дапусьціць зацягваньня гэтага ўдарнага будаўніцтва.

Возьмем такія, на першы погляд „дробныя", пытаньні, як пабудова новай купальні, парку культуры і адпачынку, пашырэньня зялёных насаджэньняў—гэтым пытаньням трэба аддаць належную ўвагу, бо нельга дапусьціць, каб працоўныя не маглі карыстацца здаровым адпачынкам пасьля работы ўлетку.

І, нарэшце, трэба палепшыць санітарна-гігіенічнае становішча гарадоў, узмацніць санітарны нагляд за становішчам двароў і вуліц.

Камунальная гаспадарка не павінна быць „вузкім месцам" сацыялістычнага будаўніцтва. Камунальная гаспадарка павінна адпавядаць нарастаючым запатрабаваньням працоўнага насельніцтва. Так паставіў гэта пытаньне Чэрвенскі пленум ЦК УсеКП(б).

Б-ў.

Апавяданьне Ул. Мяжэвіч.

За Аксіньняй зачыніліся на вуліцу дзьверы. Аксіньня ішла спачатку ціха, потым шпарчэй пабегла па знаёмай дарозе праз рэчку, на гару, і схавалаея ў сасновым бары.

III

— Аксіньня Пятроўна, дапамажы, галубка! Зноў у мяне сапсаваўся чоўнік—гукала ткач Васільева і яе голас губляўся ў шоламе і сьпевах трансьмісій ткацкіх варштатаў. Аксіньня не пачула слоў Васільевай. Яна сёньня перайшла з двух варштатаў на тры, як у калаўроце круцілася каля сваіх трох машын, лоўка мінавала шківы, пасы, падбягаючы ад аднаго да другога варштату, папраўляла пражу, укладала новыя шпулькі, правярала спраўнасьць чоўнікаў, якасьць сукна, вырэзвала ножнамі вузлы і няроўніцы ў нітках.

— Андрэй Рыгоравіч,—зьвярнулася Аксіньня да майстра,—паглядзеце на якасьць работы прадзільнага цэху. Зноў—адна няроўніца. Ірвуцца ніткі, прастойваюць варштаты.

Майстра аглядаў пражу, адрываў няроўніцу ў нітках, ківаў сівой галавой і ішоў у прадзільны цэх, па дарозе робячы выразныя заўвагі ткачом.

Пасьля поўдня ў ткацкім цэху на дошцы вялікімі літарамі Андрэй Рыгоравіч кавалкам крэйды выводзіў словы.

Першая зьмена—101,2 проц.

Жураўлёва Аксіньня дала 125% нормы, замест 80, 100 мэтр. добраякаснага сукна.

Шузьдзейка Клаўдзя—112 проц. нормы.

І на чорнай дошцы тая-ж рука запісала:

Шаблоўскі Лявон—78 проц. нормы.

Макарава Ганна—83 проц. нормы.

Паабапал дошкі сьцяна была ўпрыгожана дзесяткамі кавалкаў паперы, сярод іх асабліва вызначаўся зялёны ліст з чорнымі вялікімі літарамі. Гэта Аксіньня Жураўлёва абавязалася даць 120 проц. месячнай нормы і выклікала дзесятак ткачоў. Адказамі на выклік Аксіньні ткачы завесілі сьцяну і крыху закрылі яе зялёны кавалак паперы...

...Аксіньня сядзела ў габінеце старшыні фабкому. Павел Ніканоравіч маленькі, няпрыкметны на першы погляд чалавек, патануў у цяжкім крэсьле і толькі адтуль відна яго чорная галава, быстрыя маленькія вочы, энэргічны мужны твар. Павел Ніканоравіч уважліва слухаў Аксіньню згаджаўся, ківаў галавой, стукаў алоўкам па стале, нібы каго супакойваў, хоць у пакоі нікога ня было, было зусім ціха, толькі зьвінеў голас Аксіньні.

— Так цяжка працаваць. Хоць наша зьмена за апошні месяц і выконвае плян, але ў гэтым мала толку, другая і трэцяя падводзяць цэх—прарыў расьце. Кожны дзень пагоршваецца якасьць пражы—адна няроўніца. Трэба нешта рабіць...

— Ну, што рабіць, т. Жураўлёва?

— „Сквозную“, буксірную... Гэта дапаможа...

. . . . . .

Аксіньня стаяла на чале дзьвёх ударных брыгад: буксірнай у сваім цэху і міжцэхавай „сквозной“, працавала першай з ткачоў на фабрыцы на трох варштатах.

Праз пяць дзён „ткач“ вышаў з вялікім патрэтам Аксіньні, з лічбамі аб новых перамогах у ткацкім, прадзільным і часальным цэхах. Пад партрэтам кароткі надпіс:

„Тав. Жураўлёва, Аксіньня Пятроўна, паказвае сапраўды ўдарныя бальшавіцкія тэмпы работы. Тав. Жураўлёва за тры гады работы на фабрыцы не зрабіла ніводнага прагулу, у яе лепшая якасьць і заўсёды перавыкананая норма. Аксіньня Пятроўна першая перайшла на тры варштаты, арганізавала брыгады ў першай зьмене, зараз разгарнула работу ў трэцяй зьмене, арганізавала міжцэхавую „сквозную“ брыгаду. За апошнюю пяціднеўку фабрыка дала 89,9% праграмы, на 8 проц. больш, чым у мінулую пяціднеўку. Гэта перамога дасягнута рукамі такіх, як Жураўлёва, Шузьдзейка, Андрэеў, Макарэнкава і інш. Рукамі сапраўдных гэрояў пяцігодкі.

Ніжэй рапартавала першая буксірная і першая „сквозная“ брыгады.

— Няроўніца нітак зьнізілася ад 12 да 5,7 проц. Гэтага мала! Вон з фабрыкі няроўніцу!

І яшчэ ніжэй:

— Пролетарскае прывітаньне энтузіясту Жураўлёвай і першая прэмія.

...Позна ўвечары Аксіньня пісала рапарт газэце „Ткач“.

За трэцюю пяціднеўку сакавіка праграма ткацкім цэхам выканана на 100,2 проц., прадзільным—на 99 проц., часальным—на 96,6 проц. Адыходы воўны зьведзены да 3 проц., няроўніца складае ва ўсёй пражы 2,3 проц. Гэтага мала. Мы па-бальшавіцку змагаемся за далейшае паляпшэньне якасных паказальнікаў.

Бліскучыя ўзоры работы далі:

Першая зьмена ткацкага цэху—118 проц. праграмы.

У прадзільным цэху брыгада Івановай—104 проц. праграмы.

Брыгады ткача Шузьдзейка Клаўдзі—116 проц.

Аксіньня крыху задумалася і праз хвіліну рашуча дапісала.

І брыгада Жураўлёвай—128% праграмы.

Як зьмянілася за гэтыя гады Аксіньня, дзе што дзелася, адкуль што ўзялося! Яна і сама часта

думала над гэтым. Рабочы калектыў, варштаты, фабрыка ў яе столькі ўлілі новых сіл, веры, жаданьня, замілаваньня да сваёй работы. Аксіньня зусім не падобна на тую дзяўчыну, што стаяла ўвосень па калені ў вадзе і ліхаманкава дрыжачымі рукамі церабіла голыя пруты маладой абмёзлай лазы.

IV

— Аксіньня Пятроўна! Не забывай, інфармуй нас, часьцей пішы, зварачайся, калі будзе якая патрэба, за дапамогай. Галоўнае, не забывай, пільна сьцеражыся! Загінай рабочую лінію,—крычаў уздагон адыходзячаму цягніку старшыня фабкому. Аксіньня стаяла на падножцы вагона, ківала галавой у знак сваёй згоды, і вось яна падалася ўперад, махнула рукой, нешта сказала, але моцны гудок паравоза заглушыў яе словы, іх не пачуў Павел Ніканоравіч.

Аксіньню ўчора рабочыя аднагалосна выбралі, як лепшага, загартаванага ў баёх за прамфінплян, у баёх з прагульшчыкамі, лодырамі, шкоднікамі, байца ў лік „дваццаці пяці тысяч“ пролетараў для работы на вёсцы. Яна—адзін з маленькіх вінцікаў у агульнай машыне бурлівага жыцьця. Паездка зноў на вёску паклала на твар Аксіньні адбітак нейкай глыбокай задуменнасьці, зрабіла энэргічныя, глыбокія і ясныя вочы яшчэ больш колкімі, пранізваючымі.

Надта прывыкла да фабрычнага тлуму, зжылася з рабочымі і да дэталяй знаёмымі варштатамі, людзьмі, якія напаўнялі цэхі, блізкімі, знаёмымі, добрымі. Цяжка пакідаць фабрыку ў разгар такой барацьбы. Ці справіцца Клаўдзя з работай у „сквозной“ брыгадзе, ці будзе высока несьці першая зьмена ганаровы сьцяг перамогі?

Аксіньня перабірала ланцуг свайго жыцьця за апошнія гады і яшчэ больш пераконвалася ў цяжкасьці ростані, і гэта адчувала кожным сваім мускулам, кожнай сэкундай свайго жыцьця.

— А можа я непатрэбна на фабрыцы і мяне наўмысьля паслалі ў вёску?—пытала сама ў сябе Аксіньня і зараз-жа гэту думку адганяла, як надакучлівую, непатрэбную, шкодную муху. Успамінаўся ўчарайшы вечар. Сход бурлівы, ласкавы, прывятлівы, сур'ёзны. Шмат называлі прозьвішч, шмат гутарылі, а як зьявілася прозьвішча Аксіньні ў сьпісе, разам змоўклі работніцы і рабочыя, нібы іх ашаламілі нейкай неспадзяванкай. Нехта з задніх радоў пракрычаў.

— Правільна, Аксіньню! Толькі Аксіньню!

І прарваўся людзкі паток, нібы дынамітам узарвала залю. Аксіньня была выбрана аднагалосна, ёй стала крыўдна на самую сябе, што дапусьціла такую прыкрую думку.

Вёска патрабуе людзей, моцных духам, загартаваных, нязломных у баёх з кулацтвам. Ці вытрымаю, ці ня зьлягу, як падкошаная трава пад кулацкім ударам? Не, гэтаму ня быць!

У акрвыканкоме Аксіньню холадна сустрэлі, запыталі з якой фабрыкі, пацікавіліся вытворчым стажам, партыйнасьцю, у якім раёне жадае працаваць.

Яна беспартыйная, мае трохгадовы стаж работы на вытворчасьці і 10-гадовы ў сельскай гаспадарцы ў якасьці батрачкі. Ці ня ўсё роўна, у які раён ехаць? Аксіньня атрымала пуцёўку для работы ў раёне. Калі выйшла з памяшканьня акрвыканкому, на хвіліну спынілася, успомніла 5 год свайго жыцьця, Мікоду, Праскеду, успомніла, як дрыжачай рукой паднесла запалены запалак да страхі Мікодавай хаты. Хацела вярнуцца, пастаяла, падумала і рашуча махнула рукой.

— Ці ня ўсё роўна, дзе працаваць?

V

Старшыня калгасу „Ясная зорка“ Галькевіч Мікода холадна сустрэў работніцу, прысланую для работы ў якасьці члена праўленьня калгасу. Аглядзеў з ног да галавы, прыплюшчыў свае хітрыя вочы, крыху аб чымсьці падумаў і зьвярнуўся да Аксіньні.

— Дык вы, значыць, да нас працаваць?

— Так, працаваць,—холадна прамовіла Аксіньня і толькі націснула на слове „працаваць“.

— На доўга, дазвольце запытаць?

— *Бадай на доўга.*

— А як ваша прозьвішча, выбачайце?

— Мяне зваць Жураўлёвай.

Мікода ў пачатку пільна ўглядаўся ў Аксіньню, у ёй штосьці было знаёмае, але прозьвішча ён чуў першы раз у сваім жыцьці, падумаў, што так здалося, памыліўся і супакоіўся.

У Мікоды стаяла новая хата белая, абшаляваная, пад бляшаным дахам. Страхоўка, агнятрывалае таварыства і Кандрашоў пасадзілі Мікоду ў вялікую сьвятліцу...

Аксіньня заначавала ў былога чырвонага партызана Кандрата Ягорава. Кандрат ветліва сустрэў Аксіньню, прапанаваў ёй застацца ў яго на кватэры.

— Хоць і цесна, але памірымся. А, мабыць, жадаеце спыніцца ў Мікоды ці ў Арывона, у іх вялікія хаты, вядома, і чысьцей, і цяплей, і лепш.

Аксіньня ўспомніла цяжкі Арывонаў кулак і ёй стала прыкра ад гэтага ўспаміну.

— Не, таварыш Ягораў, калі дазволіце, я буду жыць у вас і буду вельмі ўдзячна.



Аксіньня стаяла на чале дзьвёх ударных брыгад

* * *

Кандрат нутром адчуў у Аксіньні простую і разумную жанчыну, адчуў, што яна падтрымае яго, хоць і ня зусім быў пераконан у правільнасьці сваіх думак. Кандрат чуў сваім партызанскім нутром, што „Ясная зорка"—гэта шырма, за якою хаваецца Мікода і яго кампанія, удала выкарыстоўваючы шырму для сваёй уласнай кулацкай справы. Ды ня толькі адчуваў, кожны дзень бачыў, як кулакі, як чэрві, падточваюць калгас, арганізаваны беднатой, але вёска яшчэ не зразумела, да яе розуму не дайшло, чаго дамагаецца Мікода, за чым ён прышоў у калгас.

Кандрат прабаваў „партызаніць", але адступіў пабіты і асьмеяны. Не знашоў абароны, і цяпер яго разьядалі сумненьні—можа я памыляюся, можа так і трэба, як яно ёсьць?

Кандрат доўга распытваў Аксіньню, хто яна такая, дзе працавала, адкуль родам і, калі яму Аксіньня на вуха сказала, што яна тая самая, што падпаліла Мікодаву хату, Кандрат сарваўся з лаўкі, закруціўся па хаце, як калаўрот, падбег, хапіў за рукі Аксіньню, сьціснуў у сваіх мазолістых мазолістыя...

— Ой! як добра, што вы тут! Ці думаў я. Зусім не пазнаў, зьмянілася ты надта, Аксіньня. Дзе там пазнаць!

Раптам сур'ёзная трывожная ўсьмешка прабегла па твары Кандрата і застыла, зрабіўшы твар нейкім засмучаным, занепакоеным.

— А Мікода пазнаў?

— Не, пакуль што не пазнаў.

— Значыць, добра. Пазнаюць, ой, як пазнаюць! Да трэціх пэўняў праседзела Аксіньня з Кандратам каля невялічкай газоўкі.

* * *

Сход адкрыў Мікода, агаласіў парадак дня і заўважыў.

— Да нас, значыць, пролетарыят прыслаў жанчыну для работы ў калгасе, ну, як-бы кіраваць намі...

— Што мы самі ня можам сабою кіраваць?—закрычаў Арывонаў сын,—навошта гэта!

Зашумелі калгасьнікі, дзесяткі пар вачэй уставіліся на Аксіньню, а яна сядзела з Кандратам і ціха з ім аб чымсьці гаварыла зусім спакойная, нібы была падрыхтавана да сходу і да такога спатканьня.



Дык вы, значыцца да нас працаваць?

— Можа, грамадзяне калгасьнікі, хто хоча гаварыць?—прасьпяваў Мікода, калі крыху супакоіў шумлівы натоўп.

— Аб чым гаварыць? пытаньне яснае — падтрымаў свайго сына Арывон.

— Што-ж мы, значыць, нікуда ня варты? Крыўда якая...

— Пралетарыят прыслаў— крыкнуў Сымон і яго злыя вочы зьмерылі Аксіньню.

— Хто хоча гаварыць—паўтарыў Мікода і вокам мірганuў Арывону.

Узьняўся Кандрат, агледзеў шумлівых калгасьнікаў, зьмерыў Мікоду, падышоў да стала і апусьціў свой моцны кулак на белы абрус.

— Гаварыць будзем мы! Досыць вам—нагаварыліся! Хопіць! Хто намі кіруе, былымі партызанамі, чырвонагвардзейцамі, беднякамі і батракамі? Хто? я ў вас пытаю. Былы старшыня Мікода, ураднік Арывон? Што мы безгаловыя авечкі, каб падстаўляць свой карак кулаком? Да чаго яны прывялі калгас? Пяць гаспадарак з калгасу ўжо выйшлі, заўтра выйдуць іншыя беднякі. Ці падрыхтаваны мы да сяўбы? Хутка людзі выйдуць на поле, а ў нас што? Што Мікоду патрэбны калгас? Яму патрэбна захаваць сваю хату пад бляшаным дахам, яму патрэбны нашы мазалі?

Як пчолы ў вульлі, загулі сяляне, ускочыў зьбялелы Арывон, размахваў кулакамі і крычаў на ўсю хату.

— Брэша, злодзей, гультай, абібок. Хто яму дасьць веры? Суседзі, досыць слухаць гэтага валацугу, яму ня месца сярод нас...

Мікода намагаўся нешта сказаць, але яго ніхто ня слухаў. Ня слухалі і Кандрата. Кожны гаварыў, імкнуўся перакрычаць свайго суседу. Цяжка было зразумець, аб чым крычалі 70 чал., зьбіўшыся ў кучу Толькі Аксіньня сядзела спакойная, як і раней, адна на лаўцы, на яе ніхто ўжо не зварачаў увагі, яна ўстала, прабілася да дзьвярэй, дзе адбывалася самая гарачая лаянка і спрэчка.

— Таварышы! — зазьвінеў яе голас і патануў у моры гукаў— таварышы!

Дзесяткі людзей, на чале з Кандратам, прасілі сялян супакоіцца. Кандрат стаяў побач з Мікодам за сталом і стукаў кулаком па стале.

— Слова мае работніца т. Жураўлёва.

— Я хачу, таварышы, расказаць спачатку крыху аб сабе. Мне зараз 23 гады. Апошнія тры гады я працавала на фабрыцы—дзесяць год была батрачкай...

— Беларучка,—батрачкай была—ха-ха-ха, батрачкай была!

— Ой, браточкі, батрачка, замарыла, каб на цябе ліха.

— Не, у мяне ня белыя рукі— Аксіньня падняла перад натоўпам свае грубыя, жорсткія рукі з мазалямі, якія пачарнелі ад змазкі варштатаў.

— Вы павінны памятаць, як я 5 год працавала ў вашай вёсцы, у Мікоды... Галькевіча.

Сход маўчаў.

Узьняўся і зноў апусьціўся на лаўку зьбялелы перапалоханы Мікода.

(*Працяг будзе.*)

ДА ЎСЕСАЮЗНАЙ ПЕРАКЛІЧКІ ЎДАРНІЦ

Уцягваем у рабселькораўскія рады

У студзені месяцы 1931 году пры дэлегацкім пункце арганізаваўся рабселькораўскі гурток. З самага пачатку свайго існа-

т. Калініна, брыгадзірша рамачніца на торфараспрацоўках.

ваньня гурток зьвязаўся з рэдакцыяй часопісі „Беларуская работніца і сялянка". Гурток ператварыўся ва ўдарную брыгаду друку. Брыгада ўзяла на сябе абавязак аказаць дапамогу ў правядзеньні пасеўнай і ўборачнай кампаніі.

За час сваей працы мы прарабілі наступнае: дапамаглі арганізацыі ясель і пляцоўкі, засеялі 2 гароды для задаваленьня патрэб пляцоўкі, пашылі дзіцячыя кашулі і навалачкі для ясель. Тры разы мы выходзілі ў поле ў дапамогу яўрэйскаму калгасу. Распаўсюдзілі каля 70 экзэмпляраў часопісы „Беларуская работніца і сялянка". Некаторыя жанчыны з нашай брыгады 2 дні працавалі ў саўгасе „Канстанцінава". Брыгада таксама праверыла працу дзіцячай пляцоўкі саўгасу „Канстанцінава".

Актыўна праводзім работу па ўцягненьні працоўных жанчын у рабселькораўскія рады.

Гімэльштэйн, Голуб, П. Фарбэр, Б.

Па-ўдарнаму

У веснавую сяўбу ў калгасе **„Чырвонаармеец"** арганізавалася ўдарная брыгада жанчын. Ударніца **Місьнік Агата** сваім прыкладам прыцягвае шмат калгасьніц. Ударніцы **Місьнік Куліна і Шнітко Фрасіньня**, ня маючы чарговай палявой работы выконвалі тыя даручэньні нават у мужчынскай рабоце, дзе не хапала рабочых рук.

Па сканчэньні сяўбы частка косіць, а частка перакінута ў дарожны транспарт на розныя работы. Праца вядзецца зьдзельна. Улік працы ня скончан, ня кожны калгасьнік ведае, колькі ён выпрацаваў. Яшчэ лічым палачкі. Але да 1-га ліпеня працоўныя кніжкі будуць гатовы і разданы калгасьнікам.

Ва ўборачную кампанію неабходна калгасам арганізаваць дзіцячыя ясьлі.

Калгасьніцы.

Месячнік беларусізацыі.

Праверка беларусізацыі на заводзе „Дрэваапрацоўшчык"

Нядаўна на нашым заводзе пачала працаваць камісія па праверцы беларусізацыі.

За гэты час камісія праверыла ў асноўным вялікую частку служачых, беспартыйных, камуністаў і камсамольцаў.

Праверка паказала, што некаторыя працаўнікі заводу не вялі барацьбы за нацыянальную палітыку нашай партыі і не разумеюць яе. Добра ўладаючы беларускай мовай, яны ўжывалі яе толькі ў пісьмовай форме, а ў штодзенным жыцьці карыстаюцца толькі расійскай мовай. Напрыклад Левіна Ю, Шапіра, Шчомелеў, Мінковіч і інш. матар'ял пішуць на расійскай мове і даюць машыністцы, каб яна рабіла пераклад. Гэта ні ў якім разе недапушчальна.

Некаторыя камсамольцы ўхіляюцца ад праверкі беларусізацыі, напрыклад, Вэнзэль С., яе ледзь прыцягнулі да праверкі. Гэта нам гаворыць аб тым, што камсамольская і партыйная арганізацыя недастаткова цікавіліся гэтым пытаньнем і ў выніку некаторыя камсамольцы партыйцы не разумеюць нацыянальнай палітыкі нашай партыі.

Мы не сумняваемся ў тым, што дырэктар заводу тав. Грушнеўскі разумее нацыянальную палітыку партыі, але гэта яму не дае права адмовіцца ад адказу на пытаньні камісіі па нацыянальнай палітыцы партыі. Парткалектыў павінен сказаць сваё слова.

Член камісіі па праверцы беларусізацыі на заводзе „Дрэваапрацоўшчык"

Яхновіч.

Фабком недаацэньвае задач беларусізацыі

На фабрыцы „Кастрычнік" да месячніка ў справе беларусізацыі нічога не рабілася. Толькі ў час месячніка на пасяджэньні культсэктараў і рэдкалегіі быў распрацован плян „работы па беларусізацыі", але ён застаўся на паперы.

Ніводнага сходу, па пытаньню беларусізацыі ня было праведзена за гэты час. Аб пляне фабкому маса рабочых ня ведае. Уся праца, як, напрыклад: сходы, рабочыя нарады, пасяджэньні праводзяцца *на расійскай мове. Па пляну* намечана арганізаваць гурткі па вывучэньню белмовы, але старшыня культсэктару тав. Брэгман загадала запісаць у гурткі толькі па 12—13 чалавек з кожнага агрэгату. Таму пры запісі тав. Мэламед, старшыня цэху культсэктару, гаворыць: „Хопіць праводзіць запісь", у той час, калі ў агрэгаце маецца значна больш рабочых і работніц, якія жадаюць вывучаць белмову.

У сучасны момант працуе гурток па аднаму 3-му агрэгату з 12 гадзін. Брыгада лічыць неабходным:

1) Арганізаваць гурток па ўсёй фабрыцы, каб ахапіць усіх жадаючых вывучаць белмову.

2) Правесьці вечары рабочых і паставіць даклад аб задачах беларусізацыі.

3) Праводзіць сходы і нарады на нашай фабрыцы на белмове.

Брыгада: **Падольская, Козел, Бондарава, Раманцова.**

ф-ка „Кастрычнік".

БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД З РАБОЧЫХ ВАРАШЫЛАЎЦАЎ: СТВАРАЙЦЕ ДОБРААХВОТНЫЯ БРЫГАДЫ ПА ВЫВУЧЭНЬНЮ БЕЛМОВЫ.

У паход за лён

Правільнай арганізацыяй жаночай працы забясьпечым пасьпяховае правядзеньне ўборкі і апрацоўкі ільну. Дамо сырэц сацыялістычнай прамысловасьці

Перад саўгасамі, калгасамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі ільнаводчых раёнаў БССР стаіць задача—значна пашырыць пасевы, павялічыць прадукцыю і якасьць ільну. У ільнаводчых раёнах пасеў ільну ў гэтым годзе павялічваецца ў 2—3 разы супроць мінулага году.

Пасеўнае заданьне другой бальшавіцкай вясны па пашырэньні пасева ільну выканана, але гэта яшчэ толькі першы крок у справе пашырэньня ільнаводзтва. Наперадзе—догляд пасеваў, уборка, першапачатковая апрацоўка ільну.

„Вопыт мінулага году паказвае, што супакойвацца на посьпехах калектывізацыі і пасеўнай кампаніі і недаацэньваць усёй сур'ёзнасьці задач у галіне замацаваньня калгасаў і ўборкі ўраджаю азначала-б нанесьці вялізарную шкоду справе калектывізацыі". (З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б) па дакладу тав. Якаўлева).

Ня спыняючыся на посьпехах, дасягнутых у часе сяўбы, мы павінны арганізаваць догляд ільнапасеваў і падрыхтоўку да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну.

Пастановай Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б ад 4 га мая 1931 году поліва ільну ўводзіцца, як абавязковае мерапрыемства. Па БССР створан спэцыяльны фонд прамтавараў на суму 110.000 руб. для прэміяваньня за ўжываньне поліва ільну.

Поліва ня толькі павышае ўраджай ільну і якасьць апошняга, але і значна палягчае і паскарае ручное церабленьне, яно таксама неабходна для тых ільнапасеваў, якія будуць апрацоўвацца ільнацерабільнымі машынамі.

У 1931 годзе значна пашыраецца мэханізаваная апрацоўка ільну, будуюцца 42 новыя ільназаводы, 2 заводы дабудоўваюцца. У ільнаводчых раёнах створаны 15 МТС. У БССР завозяцца 654 ільнацерабільныя машыны і 320 машын для абчосваньня ільняных галовак. Але, ня гледзячы на гэта, уборка ільну ў гэтым годзе ў асноўным будзе праводзіцца ручным спосабам. А апрацоўка ільняной трасты будзе праводзіцца не заводзкім спосабам больш як напалову.

Таму неабходна поўнасьцю выкарыстаць існуючыя саматужныя і поўсаматужныя машыны і прылады для абмалоту і апрацоўкі ільну.

Кожны калгас павінен падрыхтаваць і адрамантаваць машыны і прылады для апрацоўкі ільну. У кожным калгасе трэба скласьці канкрэтны плян правядзеньня ўборкі, абмалоту, мочкі, росьцілу, сушкі, мяцьця, трапаньня і здачы прадукцыі. Вызначыць тэрміны правядзеньня паасобных работ. Гэтыя пляны трэба абавязкова абгаварыць на сходах калгасьніц.

Для правядзеньня ўборкі і апрацоўкі ільну ў калгасах арганізуюцца спэцыяльныя ільнаводчыя брыгады, за якімі замацоўваюцца пэўныя вучасткі ільнапасеваў, прычым брыгада адказвае за правядзеньне ўсіх работ на гэтым вучастку, пачынаючы з поліва, церабленьня ільну і канчаючы здачай прадукцыі. Асноўнае ядро брыгады на чале з брыгадзірам павінна захоўвацца да сканчэньня ўсіх работ.

Брыгада павінна мець каляндарны плян правядзеньня паасобных работ, даведзены да кожнай калгасьніцы (члена брыгады).

Усе работы па ўборцы і апрацоўцы ільну павінны быць арганізаваны зьдзельна з улікам працы ў працаднёх.

Па кожнай паасобнай рабоце трэба ўстанавіць нормы выпрацоўкі, выходзячы з вопыту працы лепшых ударнікаў.

Брыгада робіць улік працы палольшчыц у калгасе імя Тэльмана, Койданаўскага раёну.



Новы дом пабудаваны для рабочых у саўгасе Бабруйскага ЦРК.

Ільнаводзтва патрабуе шмат жаночай працоўнай сілы. Арганізуючы ў калгасах і саўгасах дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі і грамадзкае харчаваньне, мы вызвалім шмат жанчын для ўборкі і апрацоўкі ільну.

Трэба шырока разгарнуць сацспаборніцтва паміж калгасьніцамі і работніцамі саўгасаў на лепшае правядзеньне работы па поліве і апрацоўцы ільну. Ударныя брыгады і лепшых ударніц-калгасьніц трэба прэміяваць з фондаў, якія складаюцца для гэтага.

Уборка і пераапрацоўка ільну ў 1931 годзе будзе праводзіцца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы; як і ў часе веснавой сяўбы кулацтва зьбярэ свае апошнія сілы, каб перашкодзіць правядзеньню асеньняй ільняной кампаніі.

Шырокія масы калгасьніц, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, дадуць жорсткі адпор спробам кулацтва і яго агентуры—правых апартуністаў—перашкодзіць з посьпехам выканаць плян разьвіцьця ільнаводзтва.

Кузоўскі.

Рахунак

Да рахунку наказ, рабселькорак умова: савет, калгас, абмазгуй тэрмінова.

Пачалі касавіцу. Жніво на насу. Дома ўседзець—ганьба і сум. У поле, у брыгады. Слухай! Зважай! Па-ўдарнаму зьбярэм увесь ураджай!



Яські пустуюць.

Той, хто ўлетку толькі калупае ў носе, на зіму застанецца галодны і босы. З поля прыбраць трэба ўсё да чыста. Стройся ў брыгады, на чале камуністы. Стаўка кулацкая будзе біта: лішкі дзяржаве і самі сыты. Гэта наш лёзунг, ня проста прадмова.

Зараз праверым, і выкажам словам, у патрабаваньні параду дамо тым, у каго ня ўсё на мазі.

Усім калгасьніцам—на поле. Дзеці ў яськях—з плеч гара, бо малых цягаць у прыполе адышла даўно пара. А сядзець над імі ў хаце кожнай матцы—страт мяшок. У гурт сабраць іх, даглядаці лепш паставіць дзьвёх жанок. Дзеці ў доглядзе: ня злужа нос (на тое і яські ў нас), ня бултыхнецца ў калюжу.

Толькі ня кожны калгас варушыць мазгамі, як кажуць, аб малых. Наконт гэтага думку мы разьвяжам пра калгас „**Чырвоны фронт**“ (Магілеўскі р-н).

„Яські калгасу „Чырвоны фронт“, Машынацкага сельсавету, забясьпечаны былі абслугоўваючым пэрсаналам, абсталяваньнем, ядою і вопраткаю. Але ў яськях толькі 2 дзяцей. Цацкі парасьцягвалі па хатах. Яські не працуюць таму, што для працы ў іх шкадуюць паставіць аднаго чалавека. За тое дзеці перашкаджаюць у працы ўсім маткам“.

Так выходзіць: пагнаўся за капейкай, а страціў рубель.

Зараз мы патрабуем адказу калгасу імя „**Сьценькі Разіна**“.

Дзяцей тут ёсьць багаты выбор, а для яськяй ніхто палец аб палец ня ўдарыў. Яські для іх упаўнаважаны сам зьляпаў: мэблю змайстравалі, вопратку схапалі. Раён дадаў 200 рублёў грашыма. І працы няма: яські зачынены.

Што тут за штука, у чым прычына: чаму не разьвяжуць рукі жанчынам? Чаму дасюль самі жанкі калгасныя ня возьмуцца як сьлед за будаўніцтва яськяй?

* * *

Ня лепшыя яськям умовы падалі ў старым калгасе імя Сталіна. Ад старшыні яго Вайцянкова—лоб разьбі—ня выцісьнеш слова; яські па яго—справа дзесятая. Ён больш важным заўсёды заняты: замест удзелу ў сходзе жаночым, ён у тэатр сьпяшае, крочыць.

... а дзеці матку з поля цягнуць.

Так мы акінулі вокам тройку калгасаў Магілеўскага р-ну—суседзяй недалёкіх.

Чым-жа могуць пахваліцца нам усім калгасы таго-ж раёну: „**Чырвоны барацьбіт**“ і імя „**9-га зьезду ЛКСМ**“.

А мы наш рахунак закругляем парадай:

Калгасьніцы, вылучайце ўдарныя брыгады. Даручэце ім разам з кіраўніцтвам да ўборачнай яськяй дзіцячых дабіцца. Яські малых дагледзяць болей, а маткі будуць лепей ударнічаць у полі.

(Скарыстаны допісы селькорак Г. М. і інш).

Дайце яські

Аб'яднаўшыся ў калгас „X зьезд саветаў“, 23 гаспадаркі так старанна ўзяліся за працу, што, дзякуючы гэтаму, пачаўся вялікі прыліў: цяпер у калгасе 64 гаспадаркі.

Калгасьніцы ў часе веснавой сяўбы разьбіліся на брыгады: адна брыгада рэзала бульбу, другая сеяла, трэцяя разьбівала гной. Калгасьніцы таксама аралі і баранавалі поле.

Працуюць калгасьніцы па-ўдарнаму, ёсьць ударныя брыгады. Зараз калгас перайшоў на зьдзельшчыну.

Усе калгасьніцы жадаюць выйсьці на ўборку сена і жніво. Кепска толькі, што ў нас дасюль няма яськяй. Памяшканьне, ранней намечанае пад яські, не адрамантавана, пустуе.

Круглянскі раён.

Калгасьніца.

Ад рэдакцыі. Кіраўніцтву калгасу, разам з актывам калгасьніц трэба паклапаціцца аб арганізацыі яськяй да ўборачнай.

Ад калгасьніц мы чакаем, каб у сваіх допісах яны падрабязна апісалі, як арганізавана зьдзельшчына.

Дзяцей у яські, а самі на торф

Яські на Асінторфу надзвычай патрэбны, ахапіўшы дзяцей, яны дадуць магчымасьць жонкам рабочых і служачых пайсьці працаваць на торфараспрацоўкі.

Таму жонкі рабочых і служачых Асінторфу з ахвотаю згадзіліся пашыць тысячу пар рэйтузаў для торфяніц. Атрыманыя грошы парашылі аддаць на арганізацыю яськяй.

Таксама на карысьць яськяй арганізавалі двухдзенны суботнік на торфе.

Зараз у пасёлку Шыбаны (Асінторфе) ужо адкрылі дзіцячыя яські.

Узросшую актыўнасьць хатніх гаспадынь слаба скарыстоўваюць грамадзкія арганізацыі заводу.

Хатняя гаспадыня.

Арганізацыя дзіцячых устаноў павялічвае рост жаночай працы ў прамысловасьці, у калгасах і саўгасах

(Рэйд рабселькорак)

Трэба выканаць гэты пункт калектыўнага дагавору

Дзіцячы сад акулярнай фабрыкі абслугоўвае 65 дзяцей. Працуе бесьперапынна з 7½ раніцы да 5½ вечара. І ўсё-ж такі дзіцячы сад не прыстасован, каб абслугоўваць другую зьмену.

Дзіцячы сад забясьпечан пэдагогічным кіраўніцтвам і мэдычным наглядам. Кожную пяціднеўку прыходзіць доктар з дзіцячае амбуляторыі, які праводзіць прафіляктычную работу.

Наведвае дзіцячы сад 50 проц. дзяцей. Больш акуратнае наведваньне ўлетку—50-60 дзяцей. Зімою прыходзіць на больш 25-30 даяцей. Гэта тлумачыцца тым, што дзеці прыходзяць з чатырох раскіданых раёнаў Віцебску.

Сад кепска абсталёван: няма спальні, не прыстасавана мэбля.

Ёсьць бацькаўскі камітэт, але ў работу бацькі ня ўцягнуты.

Памяшканьне цеснае, бруднае, неадрамантаванае. Карыстаюцца агульнай з кватэрантамі кухняй. Зараз дзіцячы сад існуе зусім без каштарысу.

Між іншым, у калектыўным дагаворы (акулярнай фабрыкі) ёсьць пункт, паводле якога адміністрацыя фабрыкі абавязваецца ўтрымліваць для фабрыкі ясьлі і дзіцячы сад. Для ясьляй намерваліся пабудаваць дом. Навазілі цэглы, дошак, але пасьля гэта справа заглохла.

Спадзяемся, што гэта пытаньне ўзварушыць „Беларуская работніца і сялянка".

Брыгада: **П. Андрэева, Цімафеева, Багунова, Старэмніч, Ілкейт, Голубева.**

Наладзіць культ-масавую работу сярод работніц

Веснавая сяўба ў саўгасе імя Х-годзьдзя БССР прайшла са спазьненьнем з прычыны таго, што балота было доўгі час пакрыта вадой. Ня гледзячы на тое, што ўмовы працы ў гэту разьліўную вясну былі цяжкія, рабочыя саўгасу сяўбу правялі па-ўдарнаму. Вялікую ролю адыграла ў гэтым правільная пастаноўка працы. Рабочыя разьбіліся на брыгады, кожная брыгада працавала зьдзельна.

У саўгасе арганізаваліся ясьлі і дзіцячая пляцоўка, такім чынам работніцы мелі магчымасьць працаваць. Многія жанчыны абвясьцілі сябе ўдарніцамі. Капуста засеена выключна жанчынамі.

У працы ясьляй ёсьць недахопы. Дзеці ў саўгасе хварэюць на коклюш, а мэдычнага нагляду ў ясьлях амаль няма, бо няма доктара. І вось дзеці здаровыя заражаюцца ад хворых. Ужо больш месяца як адкрылася дзіцячая пляцоўка, а цацак для дзяцей да гэтага часу няма.

Сярод дзяцей пляцоўкі не вядзецца выхаваўчая праца, не праводзяцца гульні, дзеці, як хочуць, так і гуляюць.

У часе веснавой сяўбы сярод рабочых не вялася культ-масавая праца. Парт'ячэйка і рабачком не зварачвалі на гэта ўвагі. З іх боку ня было кіраўніцтва. У выніку гэтага—папойкі сярод некаторых рабочых.

У далейшым у часе ўборачнай кампаніі ячэйка і рабачком павінны зьвярнуць увагу, каб культ-масавая работа сярод рабочых была добра пастаўлена. Таксама трэба наладзіць работу ясьляй і пляцоўкі, каб вызваліць жаночую рабочую сілу для ўборкі ўраджаю.

Любаньскі раён.

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка" **Грыгаровіч, Іваноўская, Камнека, Наўмовіч.**

Сад № 13 не прыстасован да ўмоў працы работніц

У 13 дзіцячым садзе—72 дзяцей, якія разьбіты на 3 групы—2 польскіх і адна беларуская. Кожная займаецца на сваёй роднай мове. Выхадных дзён у садзе няма. Але **сад не прыстасаван да ўмоў працы работніц, бо ён працуе ў адну зьмену,** прычым адна група працуе з 10 да 4 гадзін і 2 групы з 9 да 6 гадзін.

Догляд дзяцей здавальняючы, але мэдычнае абслугоўваньне іх недастатковае. Толькі раз у тыдзень бывае павярхоўны мэдагляд дзяцей. Памяшканьне сада малое. Няма пакою, дзе дзеці маглі-б распрануцца. Дзеці распранаюцца ў калідоры.

У сучасны момант дзеці на 100 проц. наведваюць сад, а ўзімку наведвала—80 проц., дзеці бываюць на вольным паветры.

Пры садзе ёсьць бацькаўскі камітэт, які прыцягваецца для вырашэньня розных важнейшых пытаньняў. Бацькі плацяць за дзіця 3 проц. з сваёй зарплаты па сваёй пастанове.

Частку сродкаў дае гарсавет, Цэрабкоп не забясьпечвае сад усімі неабходнымі прадуктамі і іх дакупляюць на вольным рынку.

У садзе ёсьць 13 чалавек дзяцей, у якіх маткі не працуюць.

Менск.

Брыгада **Аўдзеенка, Кастыгава.**

Дзеці зьбіраюць каменьні на полі калгаса „Свабода" Койданаўскага раёну.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

Ахаваць лён ад шкоднікаў

У сучасны момант наглядаецца на пасевах ільну масавае зьяўленьне ільняной блошкі. Калгасьніцы павінны пайсьці на выратаваньне пасеваў ільну ад шкоднікаў. Кожны калгас павінен арганізаваць ударныя брыгады з жанчын і падросткаў для барацьбы са шкоднікамі.

Да шкоднікаў ільну трэба аднесьці ільняную блошку і ільнянога чарвяка. Ільняная блыха па знадворным выглядзе падобна да маленькага жучка. Ільняная блыха наносіць страту ўсходам ільну, калі лісткі яго і сьцябло яшчэ кволыя. Ад ільняной блыхі, калі яна зьяўляецца на полі, гінуць усходы ільну, а калі яны і ня будуць зьедзены поўнасьцю, то пашкоджаны лён адстае ў росьце і не дае належнага ўраджаю.

Блыха зьяўляецца больш у канцы красавіка і ў пачатку чэрвеня. Жывіцца ў першы час пустазельлем, якое расьце на межах. Калі зьяўляюцца ўсходы ільну, яна пераходзіць на іх і зьнішчае. Больш наносіць страты ў гарачыя сонечныя дні, менш у халодныя і дажджлівыя.

Пры зьяўленьні блыхі на пасевах трэба прарабіць наступнае:

а) Зрабіць апырскваньне пасеваў ільну растворам парыскай зеляніны з разьліку на 12 літраў вады 12—14 грам парыскай зеляніны і 24—28 грам нягашанай вапны. Каб зрабіць раствор парыскай зеляніны, патрэбна адважыць патрэбную колькасьць яе і ўсыпаць у шклянку. Да зеляніны патрэбна дадаць вялікую колькасьць вады і добра разьмяшаць да тэй пары, пакуль не атрымаецца зялёнае цеста, якое паступова растварaецца вадою. Калі ў ваду адразу ўсыпаць парыскую зеляніну, дык яна кавалачкамі будзе плаваць на паверхні вады, чаго рабіць ня трэба. Нягашаная вапна гасіцца і робіцца вапнавае малако, якое праз сіта ўліваецца ў ваду.

Зрабіўшы раствор парыскай зеляніны, трэба зараз-жа ім апырскаць пасевы ільну. Трэба памятаць, што парыская зеляніна—моцная атрута, то пры ахаладаньні раствору трэба стараца, каб пыл яе не папаў у рот. На 1 *га* пасеву ільну патрэбна 0,5—1,25 *кг* парыскай зеляніны і 1—2,5 *кг* вапны.

б) Апырскваньне растворам джыжыну. На 12 літраў вады бярэцца 14 грам джыжыну. Расходуецца джыжыну 1—1,25 *кг* на 1 *га* пасеву ільну.

в) Апыленьне раніцой пасеваў ільну парыскай зелянінай з гашанай вапнай. Для гэтага на 1 частку парыскай зеляніны патрэбна браць 8—10 частак сьвежай гашанай вапны.

д) Апыленьне ільну мыш'яковіста-кіслым кальцыем. Для гэтага на 1 частку кальцыя патрэбна браць 10—15 частак сьвежа-гашанай вапны. На 1 *га* траціцца 0,9—1,8 *кг* кальцыя і 13,5—27 *кг* вапны.

е) Апыленьне раніцой пасеваў ільну табачным пылам.

Ільняны чарвяк (гл. малюнак № 1 і № 2)

Ільняная соўка—гэта матыль, які лётае ноччу і ўдзень. Каб пазнаць яго, патрэбна паглядзець зьверху на крылкі. У ільнянога матыля ёсьць пляма, падобная да літары „У" срабрыста-белага колеру. Крылкі шэра-бура-фіялетавыя. Вясною

Мал. 1.

Мал. 2.



Мал. 3.

матыль адкладвае яйкі на пустазельле, з якіх выходзіць вусень. У першы час вусень жывіцца пустазельлем, а потым пераходзіць на ўсходы ільну і паядае іх.

Меры барацьбы

1. Апырскваньне ільну парыскай зелянінай з вапнаю (на 12 літраў вады 12—14 грам зеляніны і 24—28 грам вапны).

2. Апырскваньне джыжынам (на 12 літраў вады 14 грам джыжыну).

3. Збор вусені рукамі. Для гэтага патрэбна вусень страсаць з расьлін у вядро, напоўненае вадою з прымешкай газы.

4. Для аховы заражаных месц ад непашкоджаных ільняным чарвяком праводзяць канаўкі (гл. малюнак № 3). Для гэтага плугам праводзяць баразну так, каб адвал прышоўся ў бок заражанага поля, а адвесны бок у бок непашкоджанага. Адвесны бок павінен быць вышынёю 20—25 *см.* Сьценка павінна быць гладкая і адвесная. На дне баразны капаюцца ямкі з адвеснымі краямі глыбінёю сантымэтраў у 30—40. Калі вусень трапляе ў такую канаўку, яна паўзе ўсьцяж канавы і пападае ў ямку-калодзеж. У ямцы іх можна зьнішчыць.

Аграном **Маркавец.**